

# КРЫНІЧКА


**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**
**“Чэрнікаўшчынскі вучэбна-педагагічны комплекс**
**дзіцячы сад – базавая школа”**

Выпуск №2 (27)
Кастрычнік 2022


## У нумары:


| | |
|---|---|
| **Самы актыўны чытач школьнай бібліятэкі** | **Стар. 1** |
| **Тыдзень маці** | **Стар. 2** |
| **Дзень бацькі** | **Стар. 3** |
| **Дзейнасць ГА “БРПА”** | **Стар. 4** |
| **Клуб рэдактараў** | **Стар. 5** |
| **Шосты школьны дзень** | **Стар. 6** |


# Самы актыўны чытач школьнай бібліятэкі

10 кастрычніка на агульнашкольнай лінейцы намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці Кавецкі А.Ю. уручыў дыплом самаму актыўнаму чытачу школьнай бібліятэкі - Кандахораву Юсуфу, вучню 6 класа! Віншуем Юсуфа і жадаем яму новых перамог!!!

Няхай кніга у жыцці кожнага чалавека заўсёды будзе надзейным сябрам і дарадцам!





# Тыдзень маці




З 10 па 15 кастрычніка ў школе праходзілі шматлікія мерапрыемствы, прысвечаныя Дню маці.

Першакласнікі самі зрабілі для сваіх дарагіх матуль падарунак. І атрымалася гэта ў іх выдатна!!!

А ў 4 классе працавала **творчая майстэрня “Падарунак маме сваімі рукамі”**.







У 6 класе прайшла **класная гадзіна "Няма цябе даражэй..."**, прымеркаваная да Дня маці. Рабяты разважалі аб тым, ці лёгка быць мамай, дзяліліся ідэямі, як можна зрабіць маму шчаслівай.









У Дзень маці 14 кастрычніка ў нашай школе адбылася кульмінацыя Тыдня маці, а менавіта **ўрачысты канцэрт "Для любімых мам"**. Свае самыя лепшыя нумары паказалі вучні ўстановы. Усмешкі, слязінкі, смех .... Гэта эмоцыі шчаслівых гледачоў, сярод якіх былі члены працоўнага калектыву, мамы і бабулі вучняў. Усім без выключэння спадабаўся святочны канцэрт! Яшчэ раз віншуем любых матуль і бабуль з гэтым цудоўным святам!!!







# Дзень бацькі




**Дзень бацькі** ўстаноўлены ў Беларусі 21 кастрычніка, адпаведны Указ № 198 падпісаў 9 чэрвеня 2022 года прэзідэнт краіны Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка.

Дзень бацькі закліканы падкрэсліць асаблівую значнасць ролі мужчын у выхаванні дзяцей, стварэнні моцнай і шчаслівай сям'і.

Дата 21 кастрычніка была выбрана для святкавання, паколькі ў Беларусі склалася шматгадовая традыцыя адзначаць 14 кастрычніка Дзень маці, і зараз з'явілася магчымасць з 14 па 21 кастрычніка праводзіць бацькоўскі тыдзень.




У рамках Тыдня бацькоўскай любові ў 6 класе прайшла **класная гадзіна "Мой тата - супергерой"**, прымеркаваная да Дня бацькі. Рабяты расказвалі цікавыя факты аб сваіх бацьках, кожны даказваў, чаму менавіта яго тату можна назваць супергероем. І, вядома ж, вучні зрабілі віншавальныя паштоўкі для сваіх сапраўдных супергерояў.








Вучні пачатковай школы сваімі рукамі падрыхтавалі для татаў парарункі. Было складана, але вельмі займальна!





# Дзейнасць ГА “БРПА”

Лідэры піянерскіх дружын сабраліся 8 кастрычніка на пасяджэнні дзіцячай палаты раённага савета ГА "БРПА", у якім я, Ярашэвіч Мар’яна, прыняла ўдзел у якасці старшыні школьнай піянерскай дружыны.

Гэтае мерапрыемства было накіравана на аб’яднанне вучняў рознага ўзросту і розных школ, але зацікаўленых у адных справах; раскрыццё і ўзнаўленне тых традыцый і свят, якія былі ў піянерыі, і тых, якія засталіся з намі. Мы працавалі ў групах, прымалі актыўны ўдзел у гульнях і віктарынах.








22 кастрычніка адбылося першае паседжанне Савета Дзіцячага раённага парламента, у якім я таксама прыняла ўдзел.

Спачатку ўсе прысутныя прадставілі свае самапрэзентацыі, а потым мы працавалі ў арганізаваных падгрупах, абмяркоўвалі розныя пытанні.

Падчас паседжання адбыліся выбары ў актыў Дзіцячага раённага парламента. Мяне абралі каардынатарам дзіцячых ініцыятыў ДРП.

Гэта даволі адказная пасада. Я абяцаю прыкласці ўсе намаганні для выканання ўскладзеных на мяне абавязкаў на самым высокім узроўні.







**Ярашэвіч Мар’яна, галоўны рэдактар**

# Клуб рэдактараў

10 кастрычніка адбылося трэцяе пасяджэнне Клуба рэдактараў. Мы наведалі Дзяржынскі гісторыка-краязнаўчы музей, азнаёміліся з экспазіцыяй "Палітыка генацыду і "выпаленай зямлі". Далей мы прыступілі да абмеркавання галоўнай тэмы сустрэчы: **"Патрыёт. Хто ён?"**. Вось мае думкі наконт гэтага пытання.

Патрыёт - той, хто любіць месца, дзе нарадзіўся і вырас, свой дом, сваіх бацькоў. Ён з павагай ставіцца да мінулага сваёй краіны, вывучае яе гісторыю. Ведае дзяржаўную сімволіку, ведае правы і законы. Сапраўдны патрыёт заўсёды гатовы стаць на абарону сваёй Радзімы. А таксама ён вывучае родную мову, культуру, традыцыі і звычаі свайго народа.

Але казаць пра любоў да Радзімы, мовы, культуры - гэтага мала. Каб стаць сапраўдным патрыётам, трэба добра рабіць сваю справу. Напрыклад, добра вучыцца. Добрая вучоба - залог таго, што можна авалодаць прафесіяй, якая будзе звязана з развіццём сваёй краіны. Сапраўдны патрыёт справамі даказвае сваю любоў да Радзімы!








У першы дзень восеньскіх канікул адбылося чацвёртае пасяджэнне Клуба рэдактараў на тэму **“Ленінград. Блакада. Голад…”**.

Спачатку мы наведалі народны гісторыка-краязнаўчы музей ДУА “Навасёлкаўскі ВПК ДС-СШ”, дзе для нас была арганізавана вельмі цікавая і пазвальная экскурсія, падрыхтаваная вучнямі школы суместна з настаўнікам. Потым мы абмяркоўвалі асноўнае пытанне нашай сустрэчы: “Ленінград. Блакада. Голад…”.












**Ярашэвіч Мар’яна, галоўны рэдактар**

# Шосты школьны дзень




22 кастрычніка вучні 5-6 класаў прынялі ўдзел у **творчай гасцёўні "Мая сям'я"** у рамках Тыдня бацькоўскага любові.

Вучні расказвалі, як яны праводзяць сумесна з бацькамі свой вольны час. Абмяркоўвалі важнасць сямейных свят і традыцый. Займаліся творчасцю: сваімі рукамі зрабілі падарунак для сваіх любімых татаў, свята якіх упершыню адзначалася ў нашай краіне 21 кастрычніка.







У шосты школьны дзень 29 кастрычніка ва ўстанове адукацыі як заўсёды былі праведзены факультатыўныя заняткі, аб'яднанні па інтарэсах, спартыўныя мерапрыемствы. А таксама ў гэты дзень адбылося **свята ўраджаю "Вясёлы кірмаш"**.

На кірмашы былі прадстаўлены не толькі гародніна і садавіна, якія былі сабраны на прышкольным участку, а таксама салодкія пачастункі, прыгатаваныя навучэнцамі разам з бацькамі. У рамках свята ўраджаю былі праведзены інтэрактыўныя гульні, конкурсы, а ўсе жадаючыя маглі атрымаць асалоду ад найсмачнейшай гарбаты з сапраўднага самавара.



Галоўны рэдактар – Ярашэвіч Мар’яна, вучаніца 8 класа.
Газета выходзіць 1 раз у месяц на працягу навучальнага года.
Наступны нумар выйдзе 30 лістапада.
Тыраж – 15 нумароў. Кошт – 1 руб.